ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКАЯ газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 64(5246)
Субота, 9 чэрвеня 2001 года

Кошт у розніцу — 51 руб.

Пра што б хацелася сказаць на II з'ездзе настаўнікаў Рэспублікі Беларусь

Каб не выпусціць з рук будучыню

ПРАБЛЕМЫ школы зараз сталі, як кажуць, "притчей во языцех". Пра іх гавораць у школьных калідорах, настаўніцкіх, кабінетах дзяржаўных чыноўнікаў, з высокіх трыбун. На жаль, эканамічныя цяжкасці рэспублікі, як у люстэрку, адлюстроўваюцца і ў адукацыі.

Я часта задумваюся над тым, што адбываецца з нашай школай. Як і раней, настаўнікі з дня ў дзень "сеюць разумнае, добрае, вечнае", як і раней, у школах праходзяць розныя выхаваўчыя мерапрыемствы. Але ці заўсёды гэтыя намаганні прыводзяць да пазітыўных вынікаў? Усё менш і менш яны адпавядаюць запатрабаванням грамадства, і ў гэтым віна не толькі школы.

Як вядома, сапраўдная каштоўнасць тых ці іншых падзей вызначаецца праз дзесяцігоддзі. З вышыні пражытых гадоў усё бачыцца ў іншым святле, чым першапачаткова. Прыгадваю свае вучнёўскія гады, якія прайшлі ў Яноўскай сярэдняй школе, што на Віцебшчыне. Успаміны пра той час — самыя прыемныя. З удзячнасцю ўспамінаю сваіх настаўнікаў, якія адкрывалі мне дзверы ў краіну ведаў. Нам, падлеткам, хлапчукам і дзяўчынкам, было цікава ў школе. Паміж вучнямі і педагогамі былі добразычлівыя адносіны. Я не ідэалізую савецкую школу, і гэта не настальгія аб былых часах, але тады мы не ведалі, што такое наркотыкі, палавая разбэшчанасць, менш было падлеткавай злачыннасці.

Але жыццё не стаіць на месцы. Змяненні ў грамадстве патрабуюць змяненняў у адукацыі. Цяпер школа павінна выпускаць канкурэнтаздольную асобу. Асобу, якая зможа пастаяць за сябе, добра адаптавацца ў жыцці. Адбыліся пэўныя змяненні і ў поглядах на працэс навучання. Усё гэта выклікала неабходнасць рэфармавання адукацыі, укаранення новых тэхналогій у навучальна-выхаваўчы працэс. Мне здаецца, штосьці падобнае ўжо было не так даўно. Прозвішчы педагогаў-наватараў Ільіна, Аманашвілі, Шаталава і іншых ведалі ўсе настаўнікі, захапляліся выдатнымі вынікамі іх работы, пераймалі вопыт. Але метады наватараў не сталі масавымі ў школах. Увядзенне новага ў навучальны працэс патрабуе дадатковых намаганняў і разлічаны яшчэ на якасці асобы педагога. Тады навацыі ішлі "знізу", цяпер, наадварот — "зверху", ад дзяржаўных структур.

Рэфармаванне агульнаадукацыйнай школы ідзе цяжка. Мне бачыцца тут некалькі прычын. Па-першае, усё новае "ўспрымаецца часткай педагогаў проста як чарговы лозунг, спушчаны "зверху". Існуе думка, што час пройдзе — і пра лозунг забудуць. Па-другое, на рынку працы работнікаў адукацыі практычна няма канкурэнцыі. Наадварот, школа стаіць перад праблемай няхваткі настаўнікаў. З-за нізкай заработнай платы каля 40 працэнтаў выпускнікоў педагагічных навучальных устаноў не прыходзяць у школу, а тыя, што прыходзяць, доўга не затрымліваюцца. Па гэтай жа прычыне бывае, што ў школах працуюць выпадковыя людзі, далёкія ад педагогікі. Па-трэцяе, рэфармаванне школы, увядзенне новых тэхналогій патрабуе пэўных фінансавых сродкаў. Сучасныя настаўнікі ў сваёй большасці яшчэ не гатовы да ўкаранення новых тэхналогій у навучальна-выхаваўчы працэс. Іх трэба навучыць гэтым тэхналогіям, калі яны прыносяць добрыя вынікі і прайшлі экспертызу навукоўцаў і практыкаў. Але зараз гэта работа не адладжана. Больш таго, назіраецца спроба зрабіць з гэтага чарговую кампанію.

Цяпер навукоўцы прызналі ўжо, што 35 працэнтаў вучняў не могуць засвоіць звычайную школьную праграму. Гэта, напэўна, адна з прычын, якія спрыялі ўвядзенню дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў. Раней у школах часта квітнела прыхаванае другагодніцтва, калі тройка прыкрывала двойку. Павысіў шкалу адзнак, мы дасягнулі больш аб'ектыўнай ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў. Новая сістэма ацэнак яшчэ будзе ўдасканальвацца, але ўжо сёння яна пазітыўна ўспрымаецца настаўнікамі.

Зараз уся педагагічная грамадскасць — у чаканні другога з'езда настаўнікаў, які адбудзецца ў гэтым годзе. Неяк мне патрапіла на вочы "Настаўніцкая газета" за 11 кастрычніка 1997 года. На першай старонцы ў ёй была надрукавана "Рэзалюцыя першага з'езда настаўнікаў Рэспублікі Беларусь". З якой надзеяй мы яе чыталі! Рэальнасць жа аказалася не вельмі цудоўнай. Нагадаю невялічкую частку гэтай рэзалюцыі: "Улічваць актуальнасць існуючых праблем у адукацыі, забяспечыць распрацоўку, фінансаванне і рэалізацыю доўгачасовых рэспубліканскіх праграм: "Інфарматызацыя сістэмы адукацыі", "Сельская школа", "Замежная мова". Так, праграмы былі распрацаваны. Але, мне здаецца, на гэтым справа і спынілася. Ці падлічваў хто, колькі на гэта трэба сродкаў? Можа бюджэт дзяржавы не ў стане вытрымаць такую нагрузку і нам не трэба так размахвацца? У большасці школ не адчулі якіх-небудзь значных зрухаў на гэтых напрамках. Як можна вывучаць інфарматыку на ўстарэлых камп'ютэрах ці зусім без іх?

А якія змены адбыліся ў сельскай школе? Акрамя змяненняў у аплаце працы — ніякіх. Кажуць, вясковыя вучні маюць больш нізкія веды, чым гарадскія. І адкуль жа ім мець аднолькавыя веды, калі настаўлены яны не ў роўныя ўмовы. Амаль месяц увосень вясковыя хлапчукі і дзяўчынкі набываюць веды на палях мясцовых калгасаў і саўгасаў — удзельнічаюць у барацьбе за ўраджай. Ды і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сельскіх школ куды больш горшае, чым гарадскіх.

А чым адрозніваецца настаўнік з вёскі ад настаўніка з горада? Яны заканчвалі адны і тыя ж навучальныя ўстановы. Але ў вясковага настаўніка менш свабоднага часу, а значыць менш часу і на самаадукацыю. Акрамя школьных спраў яму трэба дагледзець і сваю гаспадарку, агарод. На настаўніцкую ж зарплату "не надта разгуляешся", як кажуць у народзе, а на зямлі, калі папрацаваць, можа штосьці і вырасці. Але вясной у настаўніка баліць галава: як апрацаваць гэты агарод, дзе купіць і на чым прывезці ўгнаенне, увосень — як хуценька ўбраць ураджай да дажджоў. Не ва ўсіх калгасах ідуць насустрач педагогу і дапамагаюць тэхнікай. А яшчэ трэба паклапаціцца пра паліва на ацяпляльны сезон. І гэтак увесь год у клопатах. Канешне, усе гэтыя і іншыя акалічнасці не спрыяюць павышэнню педагагічнага майстэрства настаўніка, стварэнню добрых умоў жыцця, таму і бягуць з вёскі маладыя спецыялісты. У сувязі з гэтым узнаўленне льгот, якія раней дзейнічалі для працуючых педагогаў у сельскай мясцовасці, лічу абавязковым.

Мне хацелася б закрануць яшчэ адну праблему, якая хвалюе, напэўна, усіх. Як жа здарылася, што ў рэспубліцы, размешчанай у цэнтры Еўропы, так многа дзяцей-сірот? Прычым у большасці сірот бацькі ёсць. Як здарылася, што бацькі практычна не адказваюць за лёс сваіх дзетак і падкідваюць іх дзяржаве на выхаванне, як зязюлі? У нашай Магілёўскай вобласці для дзяцей-сірот не хапае ўжо месц у дзіцячых дамах і школах-інтэрнатах, іх пачалі размяркоўваць па санаторных школах-інтэрнатах, спецшколах. І чарга іскаў па пазбаўленні бацькоўскіх правоў не змяншаецца. Калі ў 1990 годзе ў рэспубліцы было 11,2 тысячы дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, то ў 2000 годзе — ужо 29,1 тысячы. Калі сітуацыя ў бліжэйшыя гады не памяняецца да лепшага, Беларусь ператворыцца ў вялікі дзіцячы прытулак. А ці лепш дзіцяці ў сіроцкім доме, школе-інтэрнаце без маці і бацькі? Якая б маці ні была, дзецям хочацца да яе. Можа таму ў іх столькі жорсткасці і агрэсіўнасці, нягледзячы на ўсе намаганні педагогаў. Дзеці як бы помсцяць за аллучэнне ад сям'і. Не сакрэт, што часта выхаванцы дзіцячых дамоў, стаўшы дарослымі, становяцца такімі ж, як і іх бацькі, і аддаюць сваіх дзетак туды, дзе былі самі. Мне здаецца, тут ёсць над чым папрацаваць нашым законатворцам.

Некалі Анры Барбюс, французскі пісьменнік, заўважыў: "Школа — гэта майстэрня, дзе фарміруецца думка падрастаючага пакалення. Трэба моцна трымаць яе ў руках, калі не хочаш выпусціць з рук будучыню".

Рэформа агульнаадукацыйнай школы — гэта патрабаванне часу. Аднак многае з запланаванага можа застацца толькі на паперы, калі пад гэтыя планы не падвесці падмурак удасканаленага заканадаўства і фінансавага забеспячэння. Прамарудзіць у гэтай справе — нельга.

Мікалай СІНКЕВІЧ,
намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Дараганаўскай санаторнай школы-інтэрната.

Патрэбен "лікбез" для бацькоў

Зінаіда Канстанцінаўна АСТАПЕЦ, дырэктар сярэдняй школы № 104 Мінска:

Усе школьныя праблемы ідуць ад таго, што нідзе, уключаючы элітарныя школы, не склаўся трохвугольнік: вучань — настаўнік — сям'я. Калі б бацькі былі шчыра зацікаўлены ў выніках працы дзіцяці, калі б яны займаліся яго выхаваннем, дапамагалі яму жыць, працягвалі да яго рукі, мы былі б аднадумцамі, мы б сябравалі.

15 мая быў Міжнародны дзень сям'і, і я шмат чытала на гэту тэму. Была вельмі здзіўлена, што "сям'я" ў перакладзе з латыні азначае "голад". І сапраўды, толькі ў сям'і чалавека прымуць любога — злога, непрыгожага і хворага. Толькі ў сям'і яго будуць паважаць і разумець такога, які ён ёсць.

Але бяда ў тым, што голаду па сям'і сёння няма. Кожная другая сям'я ў нас — няпоўная, а праблемы дзіцяці пачынаюцца з таго, што яно раптам адчувае: а таты ж побач няма. У нас 16,5 тысячы дзяцей, народжаных па-за шлюбам. Але мяне прывяла ў роспач іншая лічба: 40 працэнтаў дзяцей адчуваюць сябе ў сям'ях дыскамфортна і няўтульна, ім дрэнна.

Мы гаворым: "Усё лепшае — дзецям!" Мы рэкламуем усё, што заўгодна, але няма такога закліку: "Бацькі, працягніце руку школе!" Бо калі б бацькі разам з педагогамі звярнуліся да дзіцяці, у нас бы не было столькі праблем.

Мы не можам дастукацца да бацькоў. У нас адна школа — "Сямейны дыялог", другая — "Крок насустрач"... Упрошваем бацькоў прыйсці, але разумення таго, што мы робім агульную справу, у іх няма. Мы выхоўваем дзяцей, любім іх, разумеем. Мы часцей бачым іх, чым некаторыя бацькі. Іншая мама адкрыта заяўляе, маўляў, няма калі займацца дзіцем, бо выхоўвае яго адна. Яна нават не разумее, што сорамна так гаварыць.

Зараз трое бацькоў маіх вучняў пазбаўляюцца бацькоўскіх правоў. Няхай бы хоць раз прыйшлі яны ў школу і сказалі дырэктару ці завучу, якія будуць выступаць у судзе, штосьці ў сваю абарону, каб захаваць дзяцей. Не, ім усё роўна. Яны самі кінулі сваіх дзяцей, яны ж самі гатовы і адмовіцца ад сваіх бацькоўскіх правоў.

Патрэбен "лікбез" для бацькоў — нейкі экран, спецыяльныя перадачы па радыё і тэлебачанні, газета, якую б мы раілі бацькам выпісаць, ці хаця б спецыяльная старонка ў нашай "Настаўніцкай газеце". Аб праблеме кінутых дзяцей не гаварыць — крычаць трэба. Гіне нацыя ад таго, што людзі не займаюцца выхаваннем дзяцей. І праблему гэтую трэба вырашаць на дзяржаўным узроўні.

На маю думку, школьны прадмет "Чалавек і грамадства" трэба дапоўніць і назваць — "Чалавек, грамадства і сям'я". Даўно пара ўвесці ў школьны курс этыку сямейных адносін, бо такая шчырая размова патрэбна дзецям. Людзі павінны вучыцца любіць — і не толькі суперажываць, але і сурадавацца. Калі б нашы дзеці ўмелі любіць, яны б працавалі, займаліся самаадукацыяй, больш чыталі, яны б стараліся падабацца не толькі сабе, але і сваім бацькам. Але не любяць жа яны, інакш хіба ішлі б тады красці, нягоднічаць?..

Вельмі важна вучыць дзяцей любові — гаварыць з імі, цікавіцца імі, разважаць, стварэць умовы для дыскусій. Нашым дзецям не хапае стасункаў, яны адчуваюць голад (сям'я — гэта голад) па ўзаемінах. І яго трэба задаволіць.

Звернем увагу і на здароўе дзіцяці. У класах па 2-6 чалавек у асноўнай групе па фізкультуры, астатнія — ці ў групе ЛФК, ці ў спецмедгрупе... Гэта гаворыць пра тое, што мы ўпускаем самае важнае: чалавек павінен быць фізічна здаровы, што звязана і з яго псіхічным, і маральным здароўем. Сёння ў нас выдатная праграма па фізкультуры, але няма настаўнікаў фізкультуры. Няма ў нас ні трэнажорных залаў, ні спартыўнага абсталявання. Мячоў для гульняў, і тых няма. На гэтых пытаннях таксама трэба засяродзіць пільную ўвагу, бо здароўе нацыі — перш за ўсё.

Падрыхтавала Галіна СІДАРОВІЧ.

Падрабязнасці для "НГ"

Трывалы падмурак інтэграцыі

Напрыканцы мая ў Маскве адбылася канферэнцыя па распрацоўцы Расійска-Беларускай саюзнай праграмы "Стварэнне Саюзнага навукова-адукацыйнага цэнтра — Універсітэта інтэграцыі". Беларускую дэлегацыю на канферэнцыі ўзначальваў намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь, прафесар, член-карэспандэнт НАНБ П.Дз.Кухарчык.

— Пётр Дзмітрыевіч, у студзені адбылася сумесная калегія Міністэрстваў адукацыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, дзе былі абазначаны асноўныя рысы Саюзнага навукова-адукацыйнага цэнтра — Універсітэта інтэграцыі. Потым гэтае пытанне абмяркоўвалася на шматлікіх рабочых нарадах. І вось, нарэшце, адбылася сустрэча ў Маскве. На якім этапе сёння працэс стварэння Універсітэта інтэграцыі?

— У Маскве мы разам з міністрам адукацыі Расійскай Федэрацыі падпісалі мемарандум аб утварэнні Саюзнага навукова-адукацыйнага цэнтра — Універсітэта інтэграцыі, а таксама вучэбна-метадычнага аб'яднання, якое будзе распрацоўваць неабходны метадычны інструментарый. На канферэнцыі прысутнічалі прадстаўнікі пяці ВНУ нашай краіны і кіраўнікі ВНУ Расійскай Федэрацыі, якія падпісалі двухбаковыя пагадненні аб супрацоўніцтве. Плануецца, што ўжо сёлета з саюзнага бюджэту будуць выдзелены сродкі для выканання праграмы "Стварэнне Саюзнага навукова-адукацыйнага цэнтра — Універсітэта інтэграцыі".

— У якім ён будзе — Універсітэт інтэграцыі?

— Гэта будзе размеркаваны універсітэт. Напрыклад, двухгадовую агульнанавуковую падрыхтоўку малады чалавек зможа атрымаць дома, у беларускай ВНУ, а прафесійную — скажам, у Санкт-Пецярбургу ці іншым расійскім горадзе, дзе рыхтуюць адпаведных спецыялістаў. Наша краіна невялікая, і не па ўсіх спецыяльнасцях тут варта адкрываць падрыхтоўку. Больш мэтазгодна і таннa накіраваць студэнтаў на вучобу ў Расію. Так, сіноптыкаў для Беларусі можа рыхтаваць Санкт-Пецярбургскі універсітэт. Вінаробчую навуку, безумоўна, лепш атрымаць у Краснадары і г.д. Універсітэт інтэграцыі можа прынесці шмат карысці як Беларусі, так і Расіі.

Універсітэт інтэграцыі можа прынесці шмат карысці як Беларусі, так і Расіі.

— Якая карысць для Беларусі — зразумела. Але ж у вялікай Расіі, напэўна, рыхтуюць спецыялістаў па ўсіх спецыяльнасцях. Што можам прапанаваць ёй мы?

— Так, у Расіі каля тысячы вышэйшых навучальных устаноў. Але многія маладыя людзі з беларуска-расійскага памежжа, а таксама з Калінінградскай вобласці хацелі б атрымліваць адукацыю ў нашай краіне. 471 чалавек з Расіі вучыцца сёння ў нас — ім зручней ехаць з Бранска ці Смаленска ў Гомель ці ў Магілёў, чым у Маскву. Па-першае, танней, а па-другое, засталося паміж расіянамі і беларусамі вельмі шмат сувязяў — і сваяцкіх, і сяброўскіх.

— Але дзверы беларускіх ВНУ і сёння шырока адчынены перад расійскімі абітурыентамі — яны паступаюць на тых жа ўмовах, што і беларусы. Што зменіцца са стварэннем Універсітэта інтэграцыі?

— Крышачку зменяцца вучэбныя планы і праграмы расійскіх і беларускіх ВНУ, каб зноў жа расійскія студэнты пачалі навучанне дома, а на трэцім курсе змаглі прадоўжыць прафесійную адукацыю ў навучальных установах нашай краіны. За перыяд з 1991 года вучэбныя планы і праграмы ВНУ абедзвюх дзяржаў вельмі разышліся. Але мы будуем агульную саюзную дзяржаву. Аб'яднанне ж будзе тады мець вельмі моцны падмурак, калі адбудзецца аб'яднанне ў адукацыйнай сферы.

— Мы гаворым больш пра студэнтаў. Але ж ВНУ — гэта і прафесары, і выкладчыкі. Якім чынам Універсітэт інтэграцыі паслужыць ім?

— У рамках Універсітэта інтэграцыі прадугледжана стажыроўка выкладчыкаў ВНУ абедзвюх краін (расійскіх выкладчыкаў — у нас, а беларускіх — у Расіі). Гэта вельмі важна, каб яны атрымалі магчымасць працаваць разам, ствараць агульныя праекты, ведаць, чым поўняцца знакамітыя навуковыя школы вышэйшых навучальных устаноў абедзвюх краін.

— Скажыце, якія прынцыповыя разыходжанні ў пытаннях стварэння Універсітэта інтэграцыі ёсць паміж беларускімі і расійскімі ініцыятывамі?

— Прынцыповых разыходжанняў няма. Але расіяне прапануюць, каб цэнтрам будучай установы быў Санкт-Пецярбург. Мы згодны з гэтым, але лічым, што павінен быць другі цэнтр (ці філіял яго) у Мінску. Таму што з беларускага боку ўдзел у праекце бяруць шэсць вышэйшых навучальных устаноў.

— Што будзе ўяўляць сабой цэнтр, пра які Вы сказалі (у Санкт-Пецярбургу і ў Мінску), — гэта будзе асобны будынак з пэўнай колькасцю вызваленых работнікаў ці як?

— Не, гэта будзе вучэбна-метадычны цэнтр, які павінен распрацоўваць метадычны інструментарый, вызначаць, па якіх напрамках трэба рыхтаваць спецыялістаў для саюзнай дзяржавы і г.д. Ён будзе дапамагаць вышэйшым навучальным установам інтэгравацца ў адзіную адукацыйную сістэму.

— Дзякуй, Пётр Дзмітрыевіч, за гутарку.

Галіна СІДАРОВІЧ.

У цэнтры ўвагі — дзеці

Высокапастаўленыя прадстаўнікі ўрадаў 53 дзяржаў Еўропы і Цэнтральнай Азіі абмеркавалі на сустрэчы ў Берліне шляхі паляпшэння становішча дзяцей.

Арганізавалі гэтую канферэнцыю ўрады Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, Босніі і Герцагавіны пры падтрымцы ЮНІСЕФ. Яна стала падрыхтоўкай да "Сусветнага дзіцячага саміта" ў Нью-Йорку, які адбудзецца 19-21 верасня ў якасці спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных нацый.

У канферэнцыі ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі Беларусі і Выканаўчага сакратарыята СНД.

Асаблівую цікавасць прысутных выклікалі вынікі апытання думак дзяцей і падлеткаў з 35 краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі. На сённяшні дзень гэта самае вялікае даследаванне па асноўных пытаннях правоў дзяцей. У ім узялі ўдзел больш як 15 тысяч дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 9 да 17 гадоў. Іх адказы адлюстроўваюць погляды амаль 93 мільёнаў прадстаўнікоў маладога пакалення Еўропы і Цэнтральнай Азіі.

Дэлегаты канферэнцыі зрабілі спецыяльную заяву, у якой ускладаюць на сябе абавязкі ажыццяўляць Канвенцыю ААН па правах дзяцей. Дакумент адлюстроўвае канкрэтныя мэты ў галіне палітыкі, накіраванай на абарону інтарэсаў маладога пакалення ў наступным дзесяцігоддзі. Ён з'явіўся ў выніку вялікай работы, праведзенай урадамі, грамадскімі арганізацыямі, ЮНІСЕФ і іншымі ўстановамі ААН.

Асноўнымі ж тэмамі дыскусій сталі абарона дзяцей ад насілля, праблема беднасці, стан здароўя гэтай неабароненай катэгорыі насельніцтва, даступнасць адукацыі і магчымасць дзяцей удзельнічаць у прыняцці рашэнняў, якія ўплываюць на іх будучае жыццё.

Святлана МАКАРАВА.

Навіны

Не толькі вучымся, але і даследуем

Нядаўна адбыўся Рэспубліканскі конкурс даследчых прац вучняў, які праводзілі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і аддзел інтэлектуальнай творчасці мінскага Палаца дзяцей і моладзі.

На працягу некалькіх майскіх дзён, калі за вокнамі ласкавае сонейка песціла нас, школьнікі паказвалі свае веды па той ці іншай тэме ў мінскім Палацы дзяцей і моладзі. Кожны з вучняў спрабаваў выявіць сваю даследчанасць у вобласці сусветнай гісторыі, гісторыі Беларусі, гісторыі рэлігіі, справаводства, па замежнай мове (англійская, французская, нямецкая), педагогіцы і псіхалогіі, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры, сацыялогіі і паліталогіі, этнаграфіі і экалогіі, геаграфіі і геалогіі, мастацтвазнаўстве.

"Вельмі прыемна, што да нас з'ехаліся дзеці амаль з усіх куткоў Беларусі і кожны сваёй працай уносіў нешта сваё, асабістае ў раскрыццё тэмы. Радуе тое, што дзеці не пасіўна ўспрымаюць інфармацыю, а робяць усё дзеля таго, каб наша жыццё было цікавейшым і прыгажэйшым", — гэтыя словы выказаў ад адзін з кураторaў конкурсу З.М.Пантачук.

Журы прыйшлося нялёгка — з 270 прац трэба было выбраць лепшыя. Дыпломамі пераможцаў у Рэспубліканскім конкурсе на лепшую даследчую працу вучняў былі ўзнагароджаны 119 чалавек (89 мінчан, 30 іншагародніх). Пахвальныя водгукі атрымалі 111 чалавек. Сярод дзяцей, якія прымалі ўдзел у конкурсе, былі пераважна вучні 9-11 класаў. Але ж і малодшым таксама не сядзелася на месцы. У Палац свае працы даслалі два вучні з сёмага класа і дзевяць васьмікласнікаў.

Алена ГАЛУЗА.

У біёлагаў ёсць пытанні

Пачатак мая быў адметны не толькі цёплымі сонечнымі дзяньмі, але і рэспубліканскім семінарам настаўнікаў біялогіі, тэма якога гучала так — "Пераход на новы змест біялагічнай адукацыі ў 9 класе", які прайшоў на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ў Мінску. На семінары былі разгледжаны такія актуальныя і значныя пытанні, як распрацоўка метадычных рэкамендацый па ацэньванні ведаў вучняў па дзесяцібальнай сістэме, рэалізацыя мэт і задач школьнай біялагічнай адукацыі пры вывучэнні курса біялогіі ў 9 класе, распрацоўка метадычных рэкамендацый па вывучэнні біялогіі ў 9 класе ў 2001/2002 навучальным годзе, вызначэнне падыходу да профільнай праграмы па біялогіі ў 9 класе, а таксама шэраг іншых, але не менш важных пытанняў біялагічнай адукацыі.

Асабліва востра стаяла вось якое пытанне. Зараз, калі здароўе падлеткаў штогод пагаршаецца і пытанні аховы здароўя і прапаганды здаровага ладу жыцця стаяць найбольш востра, колькасць гадзін на вывучэнне біялогіі чалавека застаецца на крытычна нізкім узроўні (1,5 урока на тыдзень!?). Перад з'ездам настаўнікаў хочацца (думаецца, настаўнікі біялогіі мяне падтрымаюць) выказаць такую думку: ці можна за такі мізэрны час закрануць усе пытанні, якія хвалююць вучняў, разгледзець пытанні гігіены і прафілактыкі захворванняў розных сістэм органаў чалавека... Пытанне пакуль рытарычнае, і, думаецца, адказ на яго з боку Міністэрства адукацыі ўсё ж знойдзецца. А цяпер настаўнікі проста вымушаны задумацца над тым, што можна выключыць з праграмы, каб уклаціся ў праграмную колькасць гадзін. Хочацца прывесці такі прыклад: па даных нядаўняга анкетавання магілёўскіх школьнікаў, менавіта біялогія займае вядучае месца, 65 працэнтаў вучняў назвалі гэты прадмет патрэбным для будучага жыцця.

Таму вельмі шкада, што з-за недахопу гадзін настаўнікам біялогіі на метадычным аб'яднанні даводзіцца абмяркоўваць, што важней для вучняў: веды пра абмен рэчываў ці пра вітаміны і іх ролю для арганізма. І як можна за тыя два-тры ўрокі з праграмы расказаць вучням пра будову мужчынскай і жаночай палавых сістэм, пра развіццё дзіцяці, цяжарнасць і роды, уплыў алкаголю, наркотыкаў і курэння на развіццё арганізма, аб венерычных захворваннях, сучасных метадах кантрацэпцыі, гігіене палавой сферы. Ці, можа, гэтыя пытанні ўжо не патрэбны вучням старшых класаў? А біялогія чалавека — адзіны прадмет у школе, дзе вучні могуць і павінны атрымаць кампетэнтную інфармацыю на гэтыя пытанні, асабліва зараз.

Матэрыялы рэспубліканскага семінара выйдуць у свет на пачатку наступнага навучальнага года. І, думаецца, што абмеркаванне шэрагу пытанняў біялагічнай адукацыі на гэтым не завершыцца. Вельмі хочацца, каб у ім прынялі ўдзел не толькі ўдзельнікі семінара, але і метадычныя аб'яднанні школ, раёнаў, гарадоў і абласцей рэспублікі, а таксама, канешне, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі нашай краіны.

Вольга СЦЯПАНАВА,
кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў біялогіі і хіміі сярэдняй школы № 35 Магілёва;
Яўген ЗАДЗІРАН.

Сардэчна запрашаем у музей авіяцыі

У сярэдняй школе № 1 Мінска ёсць музей авіяцыі. З дня яго адкрыцця прайшоў ужо год. За гэты час тут адбылося шмат змен. Ініцыятар яго стварэння — настаўнік гісторыі А.Г.Багданаў.

Падставай для стварэння такога музея стала тое, што школа знаходзіцца на вуліцы Чкалава, а побач з гэтай вуліцай мяжуе аэрапорт Мінск-1. Многія жыхары раёна працуюць на заводзе № 407. Дык каму ж, як не ім, вывучаць гісторыю авіяцыі. Па-другое, стварэнне музея дае магчымасць заняць хлопчыкаў, якія вучацца ў 7-8 класах, карысной працай — зборкай мадэляў самалётаў. У стварэнні музея дапамагалі вучні школы, іх бацькі, а таксама ветэраны Кастрычніцкага раёна сталіцы. Сёння арганізаваны авіямадэльны гурток, дзе працуюць не толькі вучні нашай школы, але і вучні з другіх школ горада. Сюды можа прыйсці любы жадаючы. У раённай адміністрацыі знаходзіцца графік наведвання. У бліжэйшы час плануецца пашырэнне музея, бо тыя экспанаты, якія ёсць, не змяшчаюцца на стэндах. У перспектыве ў нашай школе мяркуецца зрабіць музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, куды будуць перанесены ўсе мадэлі самалётаў гэтага перыяду. Наша школа сардэчна запрашае ўсіх жадаючых у музей авіяцыі.

Вольга КОЛАС,
вучаніца 11 "В" класа сярэдняй школы № 1 Мінска.

ПТА: дзень сённяшні

Думаючы педсавет

Семінар-практыкум пад такой назвай адбыўся ў Цэнтры прафесійнай адукацыі Першамайскага раёна сталіцы, дзе сабраліся намеснікі дырэктараў ПТВ па вучэбна-вытворчай рабоце. Арганізатарам гэтага мерапрыемства выступіў гарадскі вучэбна-метадычны цэнтр прафесійнай адукацыі.

Элементы рэфармавання ў сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі прад'яўляюць свае патрабаванні і да арганізацыі кіраўніцкай дзейнасці ў прафтэхустановах. Наданне галоўнаму калегіяльнаму органу кіравання ПТНУ статусу "думаючы" вызначае новую, больш эфектыўную накіраванасць педагагічнага савета, умацоўвае яго ролю ў кіраўніцкай дзейнасці ПТА, дапамагае ў асноватворных накірунках усей сістэмы ПТА.

Думаючы педсавет... Ён актывізуе думку, адганяе пасіўнасць, фарміруе асабістыя арыенціры і мэтавыя ўстаноўкі, якія вядуць да пазітыўнага педагагічнага выніку. Думаючы педсавет — гэта актыўная жыццёвая пазіцыя, гэта пастаянны творчы пошук, гэта патрэбнасць задаваць пытанні самому сабе, гэта нестандартнасць і самастойнасць мыслення.

Удзельнікам семінара было прапанавана распрацаваць праект установачнага педсавета. Папярэдне для ажыўлення думкі педагогаў былі пададзены пытанні для асэнсавання, якія закранулі адукацыйнае асяроддзе ўвогуле і непасрэдна ролю ПТВ у сістэме прафесійнай адукацыі.

У імя чаго і як сёння вучыць і выхоўваць падлетка? Мажліва, гэтае пытанне павінна стаяць у цэнтры ўвагі педагагічнай дзейнасці сённяшніх прафтэхустаноў.

"Установачны" педсавет — гэта ўмоўная назва. Гэта — думаючы, жывы педагагічны савет, які здольны разбурыць састарэлыя "ўстаноўкі" педагога, змяніць яго адукацыйныя патрабаванні з улікам карэкціраў часу.

Мэтай установачнага педагагічнага савета з'яўляецца стварэнне адпаведных умоў для пераацэнкі педагагічных каштоўнасцей, спроба змянення погляду свайго прафесійнага прызначэння, гэта карэннае абнаўленне сваёй прафесійнай дзейнасці.

Хто я як педагог? Хто для мяне навучэнец? Якое маё месца ў адзіным адукацыйным працэсе? Гэтыя пытанні сталі вядучымі ў самастойнай выпрацоўцы актыўнай пазіцыі педагога, у фарміраванні яго мысліцельнай дзейнасці.

На семінары намеснікам дырэктараў ПТВ была дадзена магчымасць спраектаваць новы, думаючы педсавет, выкарыстоўваючы пры гэтым тэхналогіі праектнага навучання.

Арыенцірамі для педагога можа служыць не толькі асэнсаванне прызначэння прафтэхустановы, але і мадэляванне вобраза выпускніка.

На семінары выпрацаваны рэкамендацыі да ўстановачнага педсавета, вынікам якога павінна стаць стварэнне банка ідэй і рэкамендацый, выпрацоўка новых арыенціраў педагагічнай дзейнасці ў прафтэхустанове. І, магчыма, выпрацаваныя падыходы такога педсавета могуць стаць стрыжнем у стварэнні агульнай праграмы развіцця ПТНУ, альбо індывідуальных праграм самаразвіцця выкладчыкаў і майстроў вытворчага навучання.

Наданне кіраўніцкай дзейнасці ў прафтэхустанове новых граняў дазваляе ствараць спрыяльныя ўмовы для высакаякаснай падрыхтоўкі спецыялістаў. Як сведчаць вынікі семінара-практыкуму, у гэтым накірунку ўжо зроблены трывалыя крокі.

Ала КЛЮЙКО.

П "Полимерснаб"

Линолеум, укладка, сварка.

Тел. (017) 213-02-99.

Разр. 06532/10001879 от 30.03.01.

Паважаныя чытачы!

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2001 года.

Падпісацца на "Настаўніцкую газету" можна ў любым паштовым аддзяленні краіны і ў агенцтвах "Белсаюздруку".

Падпісны кошт для індывідуальных падпісчыкаў на месяц — 635 рублёў, на квартал — 1905 рублёў, на паўгоддзе — 3810 рублёў.

Па ведамаснай падпісцы на месяц — 1375 рублёў, на квартал — 4125 рублёў, на паўгоддзе — 8250 рублёў.



Дзесяцікласніца сярэдняй школы № 2 Клімавічаў Юля Барсукова любіць спяваць беларускія і рускія песні, а таксама песні на англійскай мове. Яна выступала на фестывалях у Расіі і Германіі, атрымлівала там прызы і дыпломы. А нядаўна Юля прымала ўдзел у міжнародным фестывалі дзіцячых калектываў "Залатая пчолка" ў сваіх родных Клімавічах.

Фота Валерыя БЫСАВА, БЕЛТА.

Зварот

да кіраўнікоў і педагогаў навучальна-выхаваўчых устаноў розных тыпаў

Паважаныя калегі, сябры!

Патрыятычнае выхаванне як скаардынаваная, мэтанакіраваная дзейнасць па стварэнні ўмоў для ўсебаковага развіцця высокіх якасцей Грамадзяніна і Патрыёта ў сучасных умовах з'яўляецца тым звяном навучальна-выхаваўчага працэсу, якое вельмі часта вырашае яго выніковасць.

Адначасова трэба адзначыць, што толькі штодзённая, планамерная дзейнасць па выхаванні актыўных патрыётаў сваёй Айчыны можа прыводзіць да педагагічна эфектыўных вынікаў.

Але патрэбная планамернасць і сістэматычнасць у гэтай найважнейшай справе, на жаль, назіраецца не заўсёды.

Зыходзячы з гэтага, мы звяртаемся да нашых шаноўных калег — педагогаў — з шэрагам прапаноў і парад.

1. Мы лічым, што трэба пераадольваць распаўсюджаную педагагічную практыку недаацэнкі патрыятычнага выхавання непасрэдна ў працэсе выкладання вучэбных дысцыплін, бо менавіта гэта сумесна з пазакласнымі мерапрыемствамі павінна забяспечыць планамернасць і глыбіню сучаснага навучальна-выхаваўчага працэсу.

2. Патрыятычнае выхаванне толькі тады будзе адпавядаць патрабаванням часу, калі яно будзе цесна звязана з выхаваннем маральна-этычным і выступаць з ім як адзінае цэлае.

З любоўю і павагай да Радзімы непасрэдна зліты паняцці і пачуцці грамадзянскасці, абавязку, гонару, сумленнасці і прынцыповасці. Гэта якраз тыя паняцці і пачуцці, якія, на жаль, наша моладзь падчас не ўспрымае ўсім сэрцам, не заўсёды разумее, што без іх не можа ўяўляцца разумнае і прыстойнае чалавечае жыццё.

3. Абавязковай і асабліва важнай перадумовай паспяховасці патрыятычнага выхавання з'яўляецца яго дастатковае метадычнае забеспячэнне.

Педагогі-практыкі востра адчуваюць патрэбу ў метадычных напрацоўках, якія мелі б на ўвазе сучасныя ўмовы выхавання.

Іх недахоп, на наш погляд, можа быць ліквідаваны перш за ўсё сістэматычным вывучэннем і распаўсюджваннем назапашанага вопыту, у першую чаргу вопыту цеснага спалучэння класнай і пазакласнай работы.

Немалаважную ролю павінна адыграць вывучэнне і выкарыстанне і таго вопыту мінулых гадоў, які і сёння не страціў сваёй актуальнасці.

Толькі яснае разуменне прыярытэтнай ролі метадычнага забеспячэння патрыятычнага выхавання навучэнцаў можа прынесці нам поспех у гэтай важнейшай справе.

4. Патрыятычнаму выхаванню зараз, як ніколі, патрэбна грунтоўнае навукова-тэарэтычнае забеспячэнне.

Мы чакаем ад навукоўцаў-педагогаў, псіхолагаў, філосафаў і сацыёлагаў — распрацоўкі навукова-даследчых праектаў перш за ўсё па наступных праблемах:

— Вывучэнне і аналіз стану дзейнасці навучальных устаноў рэспублікі па патрыятычным выхаванні і распрацоўка ў сувязі з гэтым адпаведных рэкамендацый.

— Вывучэнне і абагульненне гістарычнага вопыту і традыцый развіцця і выхавання духоўнасці і патрыятызму.

— Аналіз навукова-педагагічнага патэнцыялу сацыяльна-гуманітарных вучэбных дысцыплін нашай сістэмы адукацыі і вызначэнне шляхоў яго рэалізацыі ў патрыятычным выхаванні.

— Распрацоўка крытэрыяў эфектыўнасці дзейнасці педагогаў і псіхолагаў па патрыятычным выхаванні навучэнцаў і методыкі іх выкарыстання.

Відавочна колькасць дысертацыйных работ, якія прысвечаны розным аспектам патрыятычнага выхавання моладзі, павінна быць значна павялічана.

Рэспубліканскі савет Беларускага педагагічнага таварыства заклікае ўсіх прадстаўнікоў педагагічнай грамадскасці да самага актыўнага ўдзелу ў вырашальным для поспеху нашай педагагічнай справы працэсе патрыятычнага выхавання навучэнцаў.

Абгрунтаваныя намі вышэй доказы прыводзяць да высновы аб неабходнасці дасканаламу абмеркавання ўсіх гэтых праблем на рэспубліканскім узроўні і прыняцця адпаведных рэкамендацый.

У сувязі з гэтым Міністэрства адукацыі, Міністэрства абароны і Беларускае педагагічнае таварыства вырашылі правесці 19 кастрычніка 2001 года ў горадзе Мінску

Рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю "Выхаванне моладзі ў духу грамадзянскасці, патрыятызму і гатоўнасці да ваеннай службы".

Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца працуючыя над вырашэннем гэтай праблемы практыкі і навукоўцы — педагогі, псіхолагі, філосафы і сацыёлагі, прадстаўнікі ветэранскіх і іншых грамадскіх арганізацый.

Рэкамендуецца наступная прыкладная тэматыка дакладаў і выступленняў на канферэнцыі:

1. Спецыфіка выхавання грамадзяніна і патрыёта ў сучасных умовах, цяжкасці, якія паўстаюць пры гэтым, і метады іх пераадолення.

2. Фарміраванне высокамаральнага маладога чалавека, патрыёта Айчыны.

3. Прыёмы і метады патрыятычнага выхавання дапрызыўнай моладзі (сумесная дзейнасць навучальных устаноў і ваенкаматаў).

4. Прынцыпы і метады фарміравання ў юнакоў псіхалагічнай гатоўнасці да службы ва Узброеных Сілах.

5. Формы і метады патрыятычнага выхавання дапрызыўнікаў у сярэдніх навучальных установах.

6. Спецыфіка патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі.

7. Методыка і патрыятычная сутнасць турысцка-краязнаўчай работы.

8. Методыка работы грамадскіх арганізацый па падрыхтоўцы маладых людзей да службы ў арміі.

9. Выкарыстанне эфектыўнага педагагічнага вопыту былых гадоў у выхаванні грамадзяніна і патрыёта.

10. Практыка патрыятычнага выхавання ва ўмовах умацавання саюзных сувязей Беларусі і Расіі.

11. Змест і формы падрыхтоўкі педагагічных кадраў да патрыятычнай работы з моладдзю.

Прыведзеная тэматыка з'яўляецца прыкладнай. Удзельнікі канферэнцыі маюць магчымасць вызначыць іншыя тэмы сваіх выступленняў (у межах агульнай праблематыкі канферэнцыі).

Памер матэрыялаў — 4 — 5 старонак машынапіснага тэксту праз паўтара інтэрвала.

Просім у абавязковым парадку паведамляць звесткі аб аўтарах: прозвішча, імя і імя па бацьку (поўнасцю), месца работы і займаемая пасада, званне, вучоная ступень (пры іх наяўнасці), службовы і хатні адрас аўтара (з указаннем паштовага індэкса, нумары службовага і хатняга тэлефону).

Матэрыялы канферэнцыі мяркуецца апублікаваць.

Тэрмін прысылкі матэрыялаў — 25 чэрвеня 2001 года.

Тэлефоны для даведак:

223 — 15 — 31 (Педагагічнае таварыства, Зубко Дзмітрый Аляксеевіч).

Матэрыялы дасылаць на адрас:

220004, Мінск, вул. Шпалерная, 7, пакой 203,

Беларускае педагагічнае таварыства.

Аркамітэт канферэнцыі па патрыятычным выхаванні.

Рэспубліканскі Савет Беларускага Педагагічнага Таварыства, Аргкамітэт Канферэнцыі

Новыя падыходы

Пачатковай школе — самастойнасць

Усе нашы маленькія вучні павінны спачатку навучацца ў пачатковай школе. У школе, якая належала б толькі ім і была незалежнай ад асноўнай (сярэдняй) школы. Можна меркаваць, што яно ў хуткім часе так і будзе. Бо папулярнасць пачатковых школ у Мінску толькі расце. Сёння ў горадзе — 8 пачатковых школ. Бацькі адзначаюць, што адасобленасць пачатковай школы ідзе толькі на карысць іх дзецям — яны вучацца з ахвотай, займаюцца мастацтвам і ўмацоўваюць сваё здароўе.

СЁННЯ мы можам сабе гэта дазволіць — адкрываць пачатковыя школы. Дзяцей апошнім часам нараджаецца мала, дзіцячыя сады пустуюць без сваіх выхаванцаў. Мы можам скарыстаць іх будынкі і іх матэрыяльную базу. Некаторыя кіраўнікі раёнаў сталіцы працуюць ужо над гэтым. У інтэрв'ю нашай газеце М.С.Ціцянкоў, начальнік гарадскога ўпраўлення адукацыі, паведаміў, што "плануецца сур'ёзна заняцца адкрыццём менавіта пачатковых школ. Дзеці будуць знаходзіцца ў камфортных умовах, у аптымальным мікраасяроддзі, толькі сярод равеснікаў — гэта вельмі спрыяльная атмасфера".

Пачатковая школа № 198 Першамайскага раёна сталіцы ўтварылася на месцы апусцелага дзіцячага садка. Ёй толькі тры гадочкі. Але сёлета яна праводзіць сваіх першых выпускнікоў (якія навучаліся па трэцяй мадэлі). Хочацца сказаць пра гэтых дзяцей, што ім пашанцавала. Пачатковая школа прадоўжыла ім радаснае дзяцінства, яна ператварыла працэс навучання ў займальную справу, дзе вучні выступаюць у якасці вынаходнікаў і здабытчыкаў ведаў.

Уражанне складваецца такое пры знаёмстве са школьнікамі, з умовамі іх жыцця, з тым, што яны робяць сваімі рукамі. Тут утульна, светла, прыгожа. Усё зроблена з любоўю. Кожны клас (а ў школе цяпер 345 дзяцей, 14 камплектаў-класаў) мае сваю невялічкую кватэрку — вучэбны пакой і пакой для адпачынку, раздзявальню. Але дзеці не зачынены ў гэтых чатырох сценах, яны сустракаюцца з усімі дзецьмі са школы падчас агульных мерапрыемстваў, на гульневай пляцоўцы вакол школы. Некаторыя заняткі праходзяць у спецыяльных кабінетах, і тады клас таксама свабодна рухаецца па школе. У такой адасобленасці класа ёсць адзін вялікі плюс — дзеці сталі менш хварэць, таму ў школе ўжо каторы год не здараецца ніякіх каранцінаў.

Працоўны дзень у пачатковай школе № 198 падзяляецца надвае. З ранку дзеці "штурмуюць" сур'ёзныя школьныя прадметы, а ў другой палове дня — малююць, танцуюць, спяваюць, граюць на музычных інструментах, займаюцца ў спартыўных гуртках. Вось так займальна бавяць яны час. Трэба сказаць, што адміністрацыя школы з разуменнем ставіцца да клопатаў працуючых бацькоў сваіх выхаванцаў, таму школа не зачыняецца да 19 гадзін.

У першай палове дня акрамя праграмных прадметаў дзеці вывучаюць англійскую мову, рыторыку, логіку і асновы інфарматыкі. Замежная мова выкладаецца з падрыхтоўчага класа — гэта даніна модзе, просьбы бацькоў. Англійскую мову можна таксама вывучаць і ў другой палове дня (па аўтарскай праграме). На занятках па рыторыцы не рыхтуюць бліскучых аратараў, дзяцей тут вучаць правільна выказваць думкі, граматна фармуляваць пытанні, умела на іх адказваць. За камп'ютэрам — самай разумнай цацкай — усе дзеці займаюцца з ахвотай, ён дапамагае развіваць маторыку рук, прывучае да самастойнай працы з тэхнікай.

Адміністрацыя школы з павагай ставіцца да сваіх супрацоўнікаў. Цяпер у школе працуюць 42 настаўнікі і выхавальнікі, ёсць таксама псіхолаг, дэфектолаг, штатная медыцынская сястра. Некаторыя настаўнікі складаюць свае (аўтарскія) праграмы, па якіх затым і працуюць. Гэта — В.Ф.Гузоўская ("Рыторыка"), Е.М.Несцяровіч ("Логіка і асновы інфарматыкі"), "Англійская мова" (аўтары-настаўнікі англійскай мовы школы). У хуткім часе будзе зацвярджаца праграма па мастацтву А.І.Сляпцовай. Школа запрашае на працу выключна спецыялістаў, людзей творчых. Мабыць таму тут замежную мову ніколі не выкладалі студэнты, а толькі вопытныя настаўнікі. Дзеці вучацца ў сапраўдных майстроў сваёй справы.

У мінулым навучальным годзе пачатковая школа № 198 атрымала статус школы з агульнаэстэтычным ухілам. Было вырашана найперш развіваць у дзіцяці яго душу, каб яно ўмела бачыць, чуць і адчуваць прыгажосць прыроды і таго, што стварае сам чалавек. Гэтыя якасці дапамогуць выхаваць заняткі па выяўленчым мастацтве, музыцы, танцы, якія абавязковыя для ўсіх школьнікаў. І ў другой палове працоўнага дня дзеці развіваюць пачуцці прыгожага. У школе створаны два тэатры, гурткі — па дызайну, мяккай цацкі, рытміцы (народны і сучасны танец), вакал, дзеці асвойваюць ігру на музычных інструментах. Тут жа працуе і свая музычная школа, дзе 24 вучні навучаюцца музыцы на класу фартэпіяна.

Пачатковая школа імкнецца жыць у згодзе з бацькамі сваіх дзяцей. Таму, напэўна, бацькі добра ведаюць настаўнікаў, а тыя знаёмы з сем'ямі сваіх выхаванцаў. Спрыяюць сяброўству і сумесныя святы, і спаборніцтвы. Унутрышкольны конкурс прафесійнага майстэрства і іншых дасягненняў школы стаў ужо традыцыйным. На конкурсе актыўныя бацькі атрымліваюць ганаровыя званні — "Правая рука" і "Надзейны сябар". Вучні спаборнічаюць па сваіх намінацыях і перамагае не толькі выдатнік, а і школьны любімчык — "Абаяннае дзяцінства". Да настаўнікаў — больш высокія патрабаванні на конкурсе, таму нават заслужыць права звацца самай лепшай першай настаўніцай вельмі цяжка. Усе пераможцы конкурсу атрымліваюць добрыя падарункі і, вядома, славу.

У пачатковай школы ёсць цудоўная будучыня. Пра гэта мы доўга вялі гаворку з дырэктарам школы № 198 Людмілай Іванаўнай Урублеўскай. Самастойная пачатковая школа мае шмат пераваг перад звычайнымі пачатковымі класамі ў вялікай школе. Калі пачатковая школа вызваліць сярэднюю ад апекі над сабой, то сярэдняя школа атрымае новыя магчымасці для плённай дзейнасці. Па-першае яна зможа працаваць у адну (першую!) змену. Паявяцца свабодныя памяшканні, што дазволіць паменшыць колькасць вучняў у класе ці адкрыць новыя вучэбныя кабінеты і творчыя майстэрні. Гэта ўсё абавязкова станоўча паўплывае на якасць навучання.

І пачатковая школа зажыве лепш. Вопыт 198-я паказвае, што ў такіх камфортных умовах для працы і адпачынку дзеці сталі менш хварэць (фізкультура, басейн, гарачае харчаванне). Выхаванцы пачатковай школы ўвесь час бачаць прыклады прыстойных паводзін, іх прывучаюць да парадку, культуры ўзаемін, вучаць ствараць вакол сябе прыгажосць. У вялікіх жа школах пачаткоўцы нярэдка з'яўляюцца сведкамі крадзяжу, лаянкі, курэння, іх могуць пакрыўдзіць старэйшыя вучні. Тут жа такое недапушчальна.

Яшчэ адзін "плюс" у самастойнасці пачатковай школы — пасля яе заканчэння можна з большай дакладнасцю вызначыць схільнасці дзіцяці і тым самым абраць для яго неабходную школу. Такім чынам знікае напружанне вакол паступлення дзяцей у падрыхтоўчыя класы гімназій і іншых элітных школ. Пачатковая школа № 198 дапамагае сваім выхаванцам вызначыцца, дзе працягваць сваё навучанне — у гімназіі, у школе з пэўным ухілам ці ў звычайнай школе. Яна супрацоўнічае з цэнтрам дасягненняў тэсціравання, спецыялісты якога даюць свае рэкамендацыі кожнаму вучню школы.

Адзінае, што яшчэ непакоіць бацькоў, калі тыя вырашаюць аддаць сваё дзіця менавіта ў пачатковую школу, што будзе з дзіцяткам, калі яму давядзецца пакідаць свой калектыў? Людміла Іванаўна супакойвае — нават дарасламу цяжка змяняць сваё асяроддзе, свае звычкі. Іх жа дзеці з падрыхтоўчага класа прывыкаюць да таго, што ўсе прадметы выкладаюць розныя настаўнікі. Увесь вучэбна-выхаваўчы працэс у школе пабудаваны такім чынам, каб дзіця свабодна адаптавалася да новага асяроддзя праз калектыўную і групавую працу. Таму іх выхаванцаў не спалохаюць ніякія змяненні ў жыцці.

Святлана КІРСАНАВА.

Сустрэчы

Дыялог атрымаўся

Напрыканцы вучэбнага семестра адбылася сустрэча міністра замежных спраў М.М.Хвастова са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ. Міністр выказаў падзяку "за магчымасць выступіць у такой прадстаўнічай інтэлектуальнай аўдыторыі" і адзначыў асноўныя накірункі сучаснай міжнароднай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

У прыватнасці, была закранута праблема супрацоўніцтва нашай краіны з афрыканскімі дзяржавамі. Як адзначыў міністр, нам жыццёва неабходна пераразмяркоўваць рэсурсы і знешнія сувязі ў бок краін трэцяга свету. Тым больш што афрыканскія дзяржавы павялічылі аб'ём імпарту. Ды і беларускі рынак немагчыма ўявіць без какава-бабоў, кавы, трапічных фруктаў, пальмавага масла, каўчуку, каштоўных парод драўніны і г.д.

Афрыка — скарбніца мінерально-сыравінных рэсурсаў. І не бяда, што там без перадыху ваююць. Калі Беларусь у якасці непастаяннага члена ўвойдзе ў Савет Бяспекі ААН на аснове прынцыпаў неўмяшання ва ўнутраныя справы, павагі да тэрытарыяльнай цэласнасці і недапушчальнасці прымянення палітыкі "двайных стандартаў", яна пастараецца ўнесці свой пасільны ўнёсак ў вырашэнне агульнапланетарнай праблемы вайны і міру. Вышэйзазначаныя прынцыпы, дарэчы, закліканы рэфармаваць гэтую самую ААН, каб яна гнутка рэагавала на патрэбнасці кожнай асобна ўзятай краіны.

Аб перспектыўнасці беларуска-афрыканскага супрацоўніцтва, па словах міністра, гаворыць шматгадовыя сяброўскія кантакты яшчэ з часоў СССР (тады пры ўдзеле БССР у некаторых афрыканскіх дзяржавах былі пабудаваны народнагаспадарчыя аб'екты, якія адыгралі не апошнюю ролю ў развіцці эканомікі), а таксама тое, што Беларусі ўдалося-такі прабіцца на рынкі Расіі і краін СНД, а гэта павінна выклікаць давер і павагу. І калі ўдасца заваяваць прыхільнасць Афрыкі, то перад намі адкрыюцца шматлікія магчымасці. Адна з іх — "аднавіць беларуска-афрыканскае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі. Вы ведаеце: нашы навучальныя ўстановы карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам. Сістэма адукацыі краіны мае кваліфікаваныя кадры, якія з поспехам маглі б працаваць у навучальных установах афрыканскіх дзяржаў на кантрактнай аснове".

Прызнацца, менавіта гэтага мы ўсе, студэнты і выкладчыкі, і чакалі — закранута тэма адукацыі. І тут пасыпаліся прапановы.

На тэрыторыі Беларусі вучыцца нямала афрыканскіх студэнтаў. Гэта можа паслужыць дадатковым каналам для ўстанаўлення кантактаў. М.М.Хвастоў зрабіў акцэнт на недастатковай увазе да навукова-даследчай работы, якая дала б магчымасць вывучыць спецыфіку рынку Афрыкі, яе экспартны патэнцыял і перспектыўныя патрэбнасці ў тым ці іншым відзе прадукцыі. Аўдыторыя засяродзіла ўвагу на іншым: на факультэце міжнародных адносін ёсць група студэнтаў, якая займаецца афрыканскай праблематыкай. І было б проста цудоўна, калі б Міністэрства замежных спраў прытуліла маладых спецыялістаў пад сваім крылом.

Не пашкодзіла б таксама прабіць інфармацыйны вакуум, які ствараецца вакол міністэрства. М.М.Хвастоў пагадзіўся з гэтымі заўвагамі, нагадаў толькі пра фінансавую праблему. Выпускнікі БДУ будуць прымацца на работу на конкурснай аснове, а недахоп інфармацыі растлумачыўся ненастойлівасцю саміх студэнтаў і выкладчыкаў. Аказваецца, студэнтам па першым патрабаванні могуць быць прадастаўлены копіі дакументаў, што дасылаюцца ў Міністэрства замежных спраў з міжнародных арганізацый. А ў выпадку неабходнасці атрымання дадатковай інфармацыі пра знешнепалітычную дзейнасць Беларусі могуць быць арганізаваны брыфінгі для жадаючых.

Такім чынам, дыялог атрымаўся. Будзем спадзявацца, што ён будзе мець працяг.

Таццяна КУПРЫЯНЧЫК, студэнтка факультэта журналістыкі БДУ.

І наваколле можа гаварыць,

або Пра школу з краязнаўчым ухілам

ПАМЯТАЕЦЕ, у дзяцінстве было ў нас, вясковай дзятвы, некалькі ўпадабаных мясцін для гульняў: разваліны замшэлай цаглянай пабудовы на ўскрайку вёскі, старыя закінутыя могілкі, зарослы хмызняком пагорак на развілцы дарог. Ніякай асаблівай інфармацыі самі па сабе яны нам не давалі, інтрыгуючы толькі чыста знешняй таямнічасцю, абумоўленай незразумелымі для нас назвамі: "Замчышча", "Стараверы", "Дот". А вось праз колькі гадоў мы пабывалі на тых жа мясцінах са сваім настаўнікам гісторыі і геаграфіі — і гэтыя маўклівыя сведкі мінулага раптам "загаварылі". І колькі адкрылася перад намі ўзнёслага, трагічнага, гераічнага...

Цяпер мы разумеем — нам пашанцавала з настаўнікам. Ён быў па-сапраўднаму ўлюбёны ў свой край. І куды б яго ні накіравалі працаваць пасля заканчэння універсітэта, ён усюды праявіў бы сябе першапраходцам пазнання даўніны, адухаўлення засечак мінуўшчыны, забытых часам і людзьмі, занадта засяроджанымі на здабыванні кавалка хлеба. Наш гісторык быў педагогам-падзвіжнікам, вельмі цікавіўся археалагічнымі даследаваннямі, усяляк імкнуўся захапіць нас напісаннем жывога летапісу Бацькаўшчыны — бязмежнай крыніцы ведаў і пачуццяў. Ён уніклівa распытваў старых людзей аб вядомых ім паданнях і легендах нашай старыны, занатоўваў атрыманыя звесткі ў свае шматлікія блакноты, а потым умела выкарыстоўваў іх на ўроках і ў час шматлікіх экскурсій і паходаў...

Сёння падобнага роду краязнаўчая дзейнасць — зусім не прыхамаць натхнёнага адзіночкі-падзвіжніка, а мэтанакіраваная і дакладна спланаваная праграма навучальна-выхаваўчага працэсу многіх школьных педкалектываў. У гэтым мы яскрава пераканаліся на прыкладзе Стараслабодскай сярэдняй школы Крупскага раёна. Апошняя акалічнасць натхняе і зараджае аптымізмам. Зварот да свайго мінулага і адухоўленае адчуванне яго славутых старонак у нашых сэрцах — найлепшая гарантыя аднаўлення высокай духоўнасці ў грамадстве, без якой немагчыма разлічваць на ўсталяванне сацыяльнай гармоніі.

Стараслабодская сярэдняя школа, дзе не так даўно нам давялося пабываць, несумненна, адна з лепшых навучальных устаноў не толькі на Крупшчыне, але і ў Мінскай вобласці. А менавіта ў сэнсе метадычнай распрацаванасці турыстычна-краязнаўчага напрамку навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Дзіўнага тут нічога няма. Калі ў свой час паўстала пытанне аб выбары асноўнага профілю навучальна-выхаваўчага працэсу, дырэктар школы Міхаіл Адамавіч Баравуля — выдатнік народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь, няўрымслівы энтузіяст-краязнаўца — разважыў рэальна. Модныя (мастацкі, фізіка-матэматычны і г.д.) профілі для невялікай сельскай школы не падыходзілі па многіх "параметрах".

Перш за ўсё, вядома, з-за адсутнасці рэальных магчымасцей у "глыбінцы" для паглыбленай прадметнай дыферэнцыяцыі.

Вось тады і прапанаваў Міхаіл Адамавіч калегам-педагогам засяродзіцца на турыстычна-краязнаўчым профілі, здолеўшы пераканаць іх у тым, што такі выбар — не толькі рэальная арэна для паспяховай педагагічнай дзейнасці ўвогуле, але і шырокае поле для індывідуальнай творчасці любога прадметніка. Сёння ніхто з настаўнікаў не сумняваецца ў правільнасці абранай спецыялізацыі: сярэдняя школа дасягнула выдатных вынікаў у даследніцка-краязнаўчай рабоце. Аб гэтым пераканаўча сведчыць ганаровае званне ўстановы — "Школа імя 100-й (1-й гвардзейскай) ардэнаноснай стралковай дывізіі". Такія "рэгаліі" не па заяўцы даюцца. Права на іх канкрэтнымі справамі дасягаецца — грамадска-карыснымі ў пазнавальна-патрыятычнай дзейнасці вучнёўскай суполкі. Гэта акалічнасць і падкрэслена ў пастанове Мінскага аблвыканкама.

Зона даследніцкіх пошукаў школы — месцы былых баёў 100-й і 161-й стралковых дывізій, 8-й Круглянскай партызанскай брыгады. А дзейнасць вучняў — не механічнае збіранне саржавелых гільзаў і касак. Гэта — выяўленне і абследаванне брацкіх магіл загінуўшых воінаў і партызан, запісы ўспамінаў уцалелых жыхароў спаленых фашыстамі вёсак Новая Слабада і Селішча Крупскага раёна, Задні Бор і Гоенка Круглянскага раёна, складанне поўных спісаў ахвяр карнай экспедыцыі гітлераўцаў "Карлебад". Гэта — стварэнне школьнага музея "Савецкая гвардыя", на базе якога наладжваюцца шматлікія экскурсіі і сустрэчы з ветэранамі вайны. Нарэшце, гэта — назапашванне багацейшага матэрыялу і яго выкарыстанне ў навучальна-выхаваўчым працэсе.

Каардынацыяй турыстычна-краязнаўчай дзейнасці ў школе займаецца спецыяльна створаны савет, які ўзначальвае сам дырэктар школы. Пасяджэнні савета праходзяць не радзей чым адзін раз у месяц, што дазваляе аператыўна ўплываць на змест практычнай пошукавай работы, своечасова ўносіць у яе неабходныя карэктывы. Арганізацыйна-тэматычны план, распрацаваны саветам на пэўны перыяд, рэалізуецца праз калектыўныя мерапрыемствы школьнага клуба "Пошук", які таксама ўзначальвае М.А.Баравуля, яго гурткоў і факультатываў "Легенды і паданні роднага краю", "Літаратурная Крупшчына", "Беларусь — мая Радзіма", "Археалогія роднага краю", "Народны каляндар", "Экалогія роднага краю" і іншыя. Вучні з дапамогай настаўнікаў выпускаюць рукапісны літаратурна-краязнаўчы альманах "Можа" (па назве мясцовай рэчкі), ствараюць гістарычныя хронікі найбольш значных вёсак Ухвальскага сельсавета.

З самага пачатку фарміраванне пошукавага клуба Міхаіл Адамавіч паклапаціўся аб забеспячэнні пераемнасці ў захаванні лепшых клубных традыцый і выкарыстанні набытага вопыту.

Зварот да свайго мінулага і адухоўленае адчуванне яго славутых старонак у нашых сэрцах — найлепшая гарантыя аднаўлення высокай духоўнасці ў грамадстве, без якой немагчыма разлічваць на ўсталяванне сацыяльнай гармоніі.

Скажам, сярод яго цяперашніх актывістаў мы бачым прозвішчы дзесяцікласніка Фёдара Фёдарава, дзевяцікласніка Дзмітрыя Усаева, сямікласнікаў Віталя Варановіча, Алены Баравулі, Вольгі ПілІпчык, Андрэя Дойнікава, шасцікласнікаў Наташы Арловай, Соні Марухінай, Дзімтрыя Глазко, вучняў чацвёртага класа Лёні Ліхалапа, Надзі Хіжынавай і іншых. Закончыць школу старэйшыя вучні — іх месца зойму дробна падрыхтаваныя паслядоўнікі, здольныя эфектыўна прадоўжыць карысныя справы сваіх папярэднікаў, арганізаваць і натхніць малодшых школьнікаў на далейшае вывучэнне гістарычнай, баявой і духоўнай спадчыны сваіх продкаў-землякоў. Менавіта з гэтага і пачынаецца фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці.

Уражвае дакладная сістэма арганізацыі турыстычна-краязнаўчай дзейнасці дзяцей і непасрэдная адказнасць педагогаў за яе рэалізацыю на пэўных этапах. Вось выпіска з перспектыўнага школьнага плана: "Класны кіраўнік 1-га класа Г.А.Юбко — заняткі па тэме "Наша школа", афармленне альбомаў "З гісторыі школы" і "Летапіс школы". Класны кіраўнік 2-га класа А.Б.Ліхалап — цыкл заняткаў па тэме "Вёска Старая Слабада" па школьнай праграме "Спадчына роднага краю", афармленне альбомаў "З гісторыі вёскі Старая Слабада" і "Летапіс вёскі Старая Слабада". Класны кіраўнік 3-га класа А.В.Кісель — цыкл заняткаў па тэме "Мікрараён нашай школы", афармленне альбомаў па гісторыі вёсак мікрараёна. Класны кіраўнік 4-га класа Л.С.Кісель — цыкл заняткаў па тэме "Ухвальскі сельскі савет", афармленне альбомаў па гісторыі прадпрыемстваў і гаспадарак сельсавета..."

Што тут перш за ўсё кідаецца ў вочы? Паступовы пераход ад простага да больш складанага з улікам узросту і набытых ведаў вучняў. Абавязковы элемент кожнай з названых ступеней пазнання — паходы выхаднога дня з паслядоўным пашырэннем аб'ектаў пазнання. У час такіх паходаў дзеці атрымліваюць канкрэтную інфармацыю аб тым, што яны бачаць вакол сябе, збіраюць адпаведны матэрыял, набываюць навыкі даследніцкай работы. У гэтым ім дапамагаюць таксама сацыяльны педагог школы А.А.Лясун, выхавацель групы прадоўжанага дня Н.А.Швед, выхавацельніца інтэрната А.У.Невядомская, якія адказваюць за прапаганду ідэй турызму і краязнаўства сярод бацькоў, абсталяванне (разам з настаўнікамі біялогіі і геаграфіі) "Экалагічнай сцежкі" і выкарыстанне апошняй у выхаваўчай і азараўленчай работе з вучнямі.

На больш "высокіх" ступенях эфектыўнасць функцыяніравання школьнай праграмы "Спадчына роднага краю" забяспечваюць намеснікі дырэктара школы: па вучэбна-выхаваўчай рабоце В.А.Папоў — кантроль за тым, каб матэрыялы турыстычна-краязнаўчай дзейнасці папаўнялі "асартымент" прадметных кабінетаў і музеяў, садзейнічаючы змястоўнаму навучальна-выхаваўчаму працэсу ў пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай рабоце; В.М.Сіняк — падрыхтоўка педагогаў да правядзення паходаў, падарожжаў і экскурсій, прыцягненне да гэтай справы спецыялістаў з адпаведных раённых і абласных устаноў, а таксама бацькоў вучняў і спонсараў, атэстацыя малодшых інструктараў турызму. Не пабаімся падкрэсліць: станоўчыя вынікі ў турыстычна-краязнаўчай дзейнасці дасягнуты дзякуючы канкрэтызацыі абавязкаў кожнага ўдзельніка навучальна-выхаваўчага працэсу.

Каб больш грунтоўна акрэсліць шырыню і паслядоўнасць краязнаўчай адукацыі дзяцей, назавём яшчэ некалькі гурткоў, якія паспяхова функцыяніруюць у Стараслабодскай сярэдняй школе: "Мой радавод", "Спадчына", "Гісторыя Бацькаўшчыны", "Юны мастак-афарміцель", "Юны археолаг", "Юны турыст", "Юны сцэнарыст", "Юны фатограф", "Закон Божы", "Музыка Беларусі", "На Крупскім Парнасе", "Юны карэспандэнт-краязнаўца"... Для глыбіннай сельскай школы — вельмі красамоўны і ўнушальны пералік. Практычна кожны вучань, пры непасрэдным далучэнні яго да "асноўнай плыні", можа выбраць адну-дзве-тры справы па душы і густу, якія ў будучым, дзякуючы ранняй прафарыентацыі, могуць дапамагчы яму без доўгіх "спроб, памылак і расчараванняў" абраць дарогу жыццёвай спецыялізацыі. Менавіта ў гэтым — галоўнае прызначэнне і прызванне школы.

Актывісты школьнага клуба "Пошук" абследавалі старажытнае гарадзішча ва ўрочышчы Задні Бор і выявілі паселішча часоў Кіеўскай Русі на правым беразе ракі Можа. Яны адшукалі таксама месцы падзення трох савецкіх самалётаў (каля вёскі Захараўка, урочышча Макрэц і паблізу ад вёскі Ухвалы), апошняя з якіх з'яўляецца верагодным месцам гібелі Героя Савецкага Саюза лётчыка Андрэя Іванавіча Папова. І ў першым, і ў другім выпадку дзеці сваёй пошукава-даследніцкай дзейнасцю вызначылі аб'екты, якія заслугоўваюць сур'ёзнага аналізу вучоных. А некалі ж усё пачыналася са звычайных паходаў выхаднога дня першакласнікаў па вуліцах роднай вёскі.

Ідэя ўвядзення краязнаўчай дзейнасці ў навучальна-выхаваўчы працэс (профіль зацверджаны пастановай Крупскага райвыканкама ў 1996 годзе) належыць Міхаілу Адамавічу Баравулі — лаўрэату шматлікіх рэспубліканскіх узнагарод. Цяпер на "пяткі" яму наступаюць яго непасрэдныя выхаванцы Надзея Хіжынава, Алена Баравуля, Таня Сакалова... Дзякуючы іх намаганням школа адзначана дзвюма граматамі Рэспубліканскага турыстычнага цэнтра, удастоена трэцяга месца ў раздзеле "Этнаграфія і археалогія" экспедыцыі "Наш край". А Надзея Хіжынава стала пераможцай праграмы "Летапісанне родных мясцін". Каштоўнымі падарункамі, граматамі і памятнымі медалямі Савета турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі "Наш край" адзначаны не адзін вучань школы.

А вось найбольш абагульнены паказчык: амаль 50 працэнтаў вучняў Стараслабодскай сярэдняй школы займаюцца на добра і выдатна пры поўнай адсутнасці другагодніку і непаспяваючых. Правільны напрамак абраў педкалектыў. Ды і на кіраўніка яму яўна пашанцавала. Як некалі нам — на настаўніка гісторыі, які ўмеў "ажывіць" наваколле.

Мікалай ГРУДЗІНСКІ, старшы выкладчык кафедры ўпраўлення Мінскага абласнога ІПК, Тамара КУРАТНІК, метадыст Мінскага абласнога ІПК.

Скажу добрае слова

Сапраўдны сельскі інтэлігент

...Ужо шмат гадоў не перастаю здзіўляцца гэтай жанчыне. Я гавару пра Любоў Фёдараўну Лайкову, настаўніцу рускай мовы і літаратуры Мётчанскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна. Памятаю, як гадоў дваццаць таму вярталася яна на аўтобусе дамоў з Мінска, трымаючы на руках маленькага сынка. Таўканіна была неймаверная, і ў мяне як выпадковага спадарожніка прамільгнула ды чамусьці запомнілася думка: "Колькі ж матчыных намаганняў прыкладаецца і яшчэ давядзецца прыкласці ёй, каб вырасціць дастойнага чалавека?!" І вырасціла ж!

Зусім нядаўна на першай паласе "Советской Белоруссии" з'явілася паведамленне, што яе сын Ваня, той самы маленькі хлопчык, а цяпер — студэнт-філолаг, рашэннем адпаведных арганізацый прызнаны лепшым маладым паэтам Беларусі 2000 года, а літаральна днямі (22.05) быў прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Ці гэта не поспех?

А дачка Лена пасля заканчэння універсітэта падарыла ёй двух унукаў.

І як гаспадыня ў

Лета–2001

Вучым, як арганізаваць адпачынак

Штогод у аздараўленчых летніках нашай краіны студэнты і навучэнцы — будучыя педагогі — праходзяць летнюю педагагічную практыку. Поспех гэтай практыкі ў многім залежыць ад якасці тэарэтычных і практычных заняткаў па падрыхтоўцы іх да работы педагогамі-выхавальнікамі.

Метадычным аддзелам Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі распрацавана і ажыццяўляецца праграма падрыхтоўкі навучэнцаў музычна-педагагічнага каледжа імя Л.С.Выгоцкага да летняй педагагічнай практыкі ў аздараўленчых летніках.

Пры распрацоўцы гэтай праграмы былі вызначаны наступныя мэты:

— падрыхтоўка навучэнцаў да арганізацыі актыўнай практычнай дзейнасці ў атрадзе;

— Як навучыць правільна арганізаваць вольны час дзяцей і падлеткаў.

Гэтая праграма складаецца з чатырох блокаў. Першы блок — тэарэтычныя і практычныя заняткі. 15-гадзінны курс уключае 12 тэм. Навучэнцы знаёмяцца з Прыкладным палажэннем аб аздараўленчым летніку, функцыянальнымі абавязкамі выхавальніка, іншымі нарматыўнымі дакументамі.

Арганізацыйны перыяд — важны і найбольш складаны прамежак часу ў аздараўленчым летніку. Ад таго, як ён будзе праведзены, у многім залежыць поспех усёй змены. Двухгадзінныя заняткі па гэтай тэме ўключаюць у сябе не толькі паведамленне неабходнай інфармацыі, але і азнаямленне з гульнямі, якія спрыяюць больш хуткаму знаёмству дзяцей адзін з адным, з педагогамі, тэрыторыяй летніка.

Задача навучыць будучых педагогаў планаваць выхаваўчую работу на аснове арганізацыі разнастайных сацыяльна значных спраў рэалізуецца на занятках, што праводзяцца ў форме КТС "Нашы справы".

Пытанням арганізацыі дзіцячага самакіравання і ўзаемадзеяння з ім выхавальніка таксама прысвечаны адны з заняткаў. Рэальна існуючае самакіраванне дае магчымасць сфарміраваць у дзяцей уменне планаваць, аналізаваць і арганізоўваць сваё жыццё ў атрадзе.

Пры распрацоўцы гэтай праграмы мы вызначылі патрыятычнае выхаванне як адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці педагога ў аздараўленчым летніку. Таму студэнты атрымліваюць канкрэтныя рэкамендацыі па распрацоўцы праграмы Дня Рэспублікі Беларусь, правядзенні акцыі "Памятаем. Ведаем. Шануем" (Лінейка памяці, віктарына, вечар "Песні ваенных гадоў").

Як павысіць выхаваўчы патэнцыял змены ў аздараўленчым летніку? Добрым памочнікам у вырашэнні гэтай праблемы з'яўляюцца калектыўныя творчыя справы. "Трэба весці дзяцей ад творчасці ў забаве да сацыяльнай творчасці...", — піша С.А.Шмакаў у сваёй кнізе "Канікулы". Ідэі раздзела "Навошта патрэбны КТС" (дзейнасць, мікрагрупа, творчасць) мы выкарыстоўваем, праводзячы двухгадзінныя заняткі "КТС у аздараўленчым летніку". Навучэнцы атрымліваюць рэкамендацыі па распрацоўцы пазнавальных, мастацкіх, забаўляльных, працоўных КТС "для дзяцей рознага ўзросту.

Некалькі заняткаў прысвечаны гульневым тэхналогіям. Гэта "Методыка адбору і правядзення рухомых гульняў", "Беларускія фальклорныя святы, гульні", "Гульнятэка ў атрадзе. Афармленне гульнёвага рэквізіту", "Свята гульні і цацкі", "Інтэлектуальныя гульні".

На кожных занятках навучэнцы атрымліваюць заданні, напрыклад, запісаць умовы 5-7 рухомых гульняў, распрацаваць праграму аднаго з тэматычных дзён і г.д. (падчас заліку выкананне гэтых заданняў правяраецца).

Другі блок — трохдзённы вучэбна-метадычны сход "Лета" (май). Праводзячы яго, мы вызначаем для сябе наступныя задачы: замацаванне ведаў і ўменняў, неабходных для арганізацыі развіццёвага баўлення часу дзяцей і падлеткаў ва ўмовах часовага дзіцячага калектыву; авалоданне навыкамі наладжвання супрацоўніцтва дзяцей і дарослых у аздараўленчым летніку; раскрыццё творчага патэнцыялу навучэнцаў музычна-педагагічнага каледжа.

Падчас сходу з кожнай вучэбнай групай-атрадам працуе метадыст-выхавальнік. Такіх атрадаў шэсць.

Вырашэнне пастаўленых задач дасягаецца з дапамогай аднаўлення і абыгрывання ключавых падзей у жыцці аздараўленчага летніка. У атрадах праводзяцца арганізацыйныя сходы. Кожны атрад выбірае сабе назву, дэвіз, песню.

Будучыя выхавальнікі вучацца праводзіць гульні, якія развіваюць навыкі ўзаемінаў — "Снежны камяк", "Музычны капялюш", "Я дару табе". Яны таксама асвойваюць гульні, якія спрыяюць выяўленню лідэраў у часовым дзіцячым калектыве ("Кінастудыя", "Фатаграфія", "Слон" і іншыя). Праводзіцца арганізацыйна-дзейнасная гульня "Сітуацыя".

Першы дзень работы завяршаецца конкурсай праграмай — эстафетай-прэзентацыяй атрадаў (працягласць праграмы 5-10 хвілін).

Ацэньваюцца выхаваўчая каштоўнасць праграмы, магчымасць яе выкарыстання ў практыцы аздараўленчага летніка, а таксама творчасць, фантазія, масавасць і гумар.

У праграме другога дня сходу — атрадная лінейка "Учорасёння", КТС "5 мадэляў тэматычных дзён" ("Дзень Рэспублікі Беларусь", "Дзень Зямлі", "Дзень вясёлых іспытаў", "Дзень кахання і дружбы", "Дзень здароўя"), творчы практыкум "Летнія гульні" для дарослых і маленькіх.

Завяршаецца дзень конкурсам эрудыцыі і творчасці атрадаў "5х5" (комплекс вясёлай фіззарадкі, слоўнік КТС, гульні з эстрады, дзіцячыя песні, "Знайсці выйсце" (рашэнне педагагічных задач).

Тэматыка заняткаў трэцяга дня прысвечана Міжнароднаму дзесяцігоддзю культуры міру і ненасілля (абвешчана ААН з 2001 па 2010 гг.). Будучыя выхавальнікі знаёмяцца з метадыкай правядзення трэнінгу па канфліктагогіі, авалодваюць уменнямі і ведамі, неабходнымі для арганізацыі дзейнасці па прафілактыцы і вырашэнні канфліктаў. Гэтыя заняткі праводзяцца з выкарыстаннем дапаможніка "Вырашэнне канфліктаў", падрыхтаванага Беларускай асацыяцыяй клубаў ЮНЕСКА.

Вучэбна-метадычны сход завяршаецца залікам.

Трэці блок — метадычныя выезды ў аздараўленчыя летнікі, дзе навучэнцы праходзяць летнюю педагагічную практыку.

Падчас выездаў арганізуюцца выставы метадычных распрацовак "Летні калейдаскоп". Метадысты Палаца творчасці дзяцей і моладзі сустракаюцца з навучэнцамі-практыкантамі, старшымі выхавальнікамі, начальнікамі летнікаў. Летась добрую ацэнку атрымала работа навучэнцаў Гомельскага музычна-педагагічнага каледжа ў аздараўленчых летніках "Рамантыка", "Прамень", "Юны хімік", "Юнга". Практыканты арганізавалі правядзенне разнастайных конкурсаў, святаў. Напрыклад, "Дзень імяніннікаў — Дзень варэння", "Дзень вясёлых іспытаў".

Чацвёрты блок — канферэнцыя, прысвечаная падвядзенню вынікаў летняй педагагічнай практыкі.

У праграме такой канферэнцыі — выстава педагагічных дзённікаў, выступленні навучэнцаў, анкетаванне. Аналіз анкет даў магчымасць высветліць, што, увогуле станоўча ацэньваючы праграму падрыхтоўкі да практыкі, навучэнцы прапанавалі дапоўніць яе тэмамі "Методыка распрацоўкі сцэнарыя", "Выхаванне культуры паводзінаў", "Методыка работы з дзецьмі з праблемных сем'яў".

На пытанне "Якія цяжкасці вы адчулі падчас праходжання педагагічнай практыкі?" адказы навучэнцаў былі такімі: арганізацыя працы (як самога выхавальніка, так і дзяцей, асабліва па самаабслугоўванні апошніх); недахоп метадычных матэрыялаў; узаеміны з дзецьмі (прычыны — грубасць, нежаданне працаваць); недахоп спартыўнага, гульневага інвентару.

Уласная творчасць, імкненне да самаразвіцця — неабходныя ўмовы паспяховага праходжання практыкі. Менавіта пра гэта напісала ў сваёй анкеце адна з навучэнак: "Праблема ў тым, што мы прывыклі штосьці браць з літаратуры, а самі не можам прыдумаць. Трэба больш развіваць самім, тады будзе менш цяжкасцяў".

Супрацоўніцтва метадычнага аддзела Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі і музычна-педагагічнага каледжа імя Л.С.Выгоцкага працягваецца. 25-27 мая гэтага года адбыўся чарговы, чацвёрты, вучэбна-метадычны збор "Лета-2001".

Людміла КУЛІК,
метадыст Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі.

Педагагічная майстэрня

Пішам сачыненне

У фарміраванні навыкаў звязнай мовы вучняў вялікая роля належыць пачатковай школе, калі закладваюцца яе асновы. Таму ў працы настаўніка асаблівае месца павінна займаць сістэмная, мэтанакіраваная дзейнасць па развіцці вуснай і пісьмовай мовы вучняў. Такую працу паспяхова ажыццяўляе настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 2 Стаўбцоў Людміла Георгіеўна Старавойтава.

Мяне вельмі зацікавіла праблема напісання сачыненняў у пачатковай школе, — гаворыць Людміла Георгіеўна. — Лічу, яна надзвычай актуальная і з'яўляецца адной з галоўных у сучасным працэсе навучання і выхавання".

Сапраўды, сачыненне — адзін з найбольш складаных відаў работы над мовай. Увесь працэс складання вучнямі тэкстаў сачыненняў і іх напісання павінен быць сістэмным, мэтанакіраваным, каб кожная новая работа садзейнічала іх разумоваму і моўнаму развіццю.

Рыхтуючы вучняў да чарговага сачынення, Людміла Георгіеўна ўзважвае, якая педагагічная мэтазгоднасць гэтай працы, чаму яна навучыць дзяцей, як узбагаціць іх мысленне і мову, і, па-другое, якое месца гэта сачыненне зойме сярод іншых практыкаванняў па развіцці звязнай мовы вучняў. Разумеючы мэту і сэнс кожнага сачынення, настаўніца свядома выбірае тую, а не іншую тэму, тып сачынення, вызначае метадычныя прыёмы падрыхтоўкі да яго, умела звязвае яе з папярэднімі і наступнымі сачыненнямі.

Так ствараецца сістэма ў працы над сачыненнямі — сістэма, якая ахоплівае значныя прамежкі часу: паўгоддзе, навучальны год, усе чатыры гады пачатковага навучання. У той жа час настаўніца стварае такія ўмовы працы на ўроку, пры якіх кожны вучань мае магчымасць праявіць сваю творчую індывідуальнасць і самастойнасць.

Дзіцячае сачыненне — гэта творчая праца, у якой вучань выяўляе сваё бачанне свету, густ, дае выхад сваёй фантазіі. Але ў той жа час гэта і навучальная праца, адно з практыкаванняў па развіцці пісьмовай мовы вучняў. Выконваючы гэта практыкаванне, дзеці вучацца:

1) назіраць, вылучаць са свайго вопыту галоўнае — тое, што адносіцца да тэмы сачынення, асэнсоўваць факты, падзеі, веды;

2) адбіраць патрэбныя для сачынення словы, будаваць словазлучэнні і сказы па законах граматыкі;

3) размяшчаць матэрыял у патрэбнай паслядоўнасці, г.зн. складаць план і прытрымлівацца яго пры складанні звязнага тэксту, а ў выпадку неабходнасці — мяняць паслядоўнасць;

4) захоўваць арфаграфічныя і пунктуацыйныя нормы, дзяліць тэкст на абзацы, захоўваць чырвоны радок і інш.

Людміла Георгіеўна ўпэўнена, што ў развіцці звязнай мовы вучняў надзвычай вялікую ролю адыгрывае малюнак. Ён уздзейнічае на пачуцці дзіцяці, адкрывае перад ім тыя бакі жыцця, з якімі ён мог бы і не сутыкнуцца ў сваім жыцці, дапамагае глыбей зразумець і тыя з'явы, якія ўжо знаёмы школьніку. Малюнак развівае назіральнасць і ўяўленне, вучыць разумець мастацтва. Настаўніца лічыць, што ўжо ў падрыхтоўчым класе трэба выкарыстоўваць малюнак як сродак развіцця звязнай мовы вучняў. Для гэтага яна бярэ серыю з 2-5 малюнкаў і вучыць дзяцей складаць план, сюжэт сачынення. Вучні, адказваючы на пытанні настаўніцы, складаюць па кожным малюнку 1-3 сказы і даюць загаловак свайму выказванню. Напрыклад, вучням падрыхтоўчага класа даюцца тры карціны:

1. Два хлопчыкі і дзяўчынка ідуць па дарозе. У руках у іх кошыкі. Удалечыні віднеецца лес.

2. Тыя ж дзеці збіраюць грыбы ў лесе.

3. Пакой. За сталом сядзіць сям'я і абедае.

Пытанні і заданні для гутаркі:

Дайце імёны хлопчыкам і дзяўчынцы. Куды яны ідуць? Для чаго? Ці многа грыбоў у лесе? Якіх? Колькі грыбоў назбіралі дзеці? Што зрабіла мама з грыбамі? Што сказалі дзецям дарослыя?

Вось які тэкст склалі вучні:

Вова, Юра і Лена пайшлі па грыбы. У лесе шмат лісічак і белых грыбоў. Дзеці назбіралі іх поўныя кошыкі. Дома мама падсмажыла грыбы. Усе елі і хвалілі людзей.

У першым і другім класах настаўніца вучыць дзяцей складаць план, даваць загалоўкі малюнкам. Затым па кожным з іх складаецца невялікі звязны тэкст і запісваецца ў выглядзе асобнага абзаца. Расказваючы ўрывак за ўрыўкам, дзеці складаюць цэлы звязны тэкст-сачыненне.

Вось як арганізавала працу настаўніца па напісанні сачынення па малюнку "Як Вася вучыўся хадзіць на лыжах". Вучням былі прапанаваны чатыры сюжэты:

1. Хлопчыкі рыхтуюцца да хадзьбы на лыжах.

2. Першыя два ўрокі лыжніка.

3. Няўдалы спуск з гары.

4. Навучыўся!

Некалькі хвілін вучні моўчкі разглядаюць малюнкі, а потым адказваюць на пытанні настаўніцы.

Да першага малюнка:

Калі адбываецца дзеянне? Куды сабраліся хлопчыкі? Як яны апрануты? Складзіце першую частку апавядання па першым малюнку. Дайце імёны тром хлопчыкам.

Да другога малюнка:

Хто навучыў навічка хадзіць на лыжах? Як трэба хадзіць? Якім быў снег у той дзень? Ці добра было хадзіць на лыжах? Ці ўдалымі былі першыя крокі навічка? Складзіце другое апавяданне.

Да трэцяга малюнка:

Дзе вырашылі пакатацца хлопчыкі? Што адбылося ў час спуску з гары? Складзіце трэцюю частку апавядання.

Да чацвёртага малюнка:

Як дапамаглі вучні Васю? Чаму Вася працягваў хадзіць на лыжах? Складзіце чацвёртую частку апавядання.

Потым ідзе праца над загалоўкам малюнкаў і ўсяго апавядання, а таксама над складаннем плана, пасля чаго вучні расказваюць поўны тэкст сачынення з выкарыстаннем апорных слоў і выразаў:

пра снег: *рыхлы, мяккі, глыбокі, круты спуск, гурба;*

пра лыжнікаў: *сабраліся, вучылі хадзіць, вучыўся, крута павярнуў, зламаў лыжу, упаў, дапамаглі, хутка хадзіць.*

Пасля такой падрыхтоўчай працы вучні самастойна афармляюць тэкст сачынення.

Вельмі складаным відам працы для вучняў пачатковых класаў з'яўляецца напісанне сачынення па мастацкай карціне, таму Л.Г.Старавойтава старанна прадумвае методыку яго правядзення. Яна арганізуе працу так, каб не толькі дапамагчы вучням скласці і запісаць сачыненне па карціне, але і паклапаціцца аб эмацыянальным уздзеянні жывапіснага палатна на вучняў, навучыць дзяцей чытаць карціну, асэнсаваць яе змест. Каб вырашыць гэтыя задачы, настаўніца ўсю працу над сачыненнем па мастацкай карціне праводзіць у такім парадку:

1. Падрыхтоўка вучняў да ўспрыняцця карціны.

2. Знаёмства з карцінай.

3. Аналіз карціны.

4. Складанне плана сачынення.

5. Знаёмства з мастаком і гісторыя стварэння карціны.

6. Моўная падрыхтоўка і слоўнікавая праца.

7. Вуснае апавяданне па плане.

8. Напісанне першага варыянта сачынення.

9. Напісанне канчатковага варыянта сачынення.

10. Аналіз творчых работ школьнікаў.

Вось як арганізуе педагог працу над сачыненнем па карціне І.І. Шышкіна "Жыта". З мэтай падрыхтоўкі вучняў да ўспрыняцця карціны настаўніца праводзіць экскурсію ці прагулку ў поле і арганізуе назіранні дзяцей за зменамі ў прыродзе. Пасля дае магчымасць вучням абмяняцца ўражаннямі, якія яны атрымалі ў час калектыўнай прагулкі:

Як выглядае жытняе поле ў ліпені, жніўні? Што можна сказаць пра жыта? Якія фарбы паявіліся ў прыродзе ў летні час? А як прыгажосць лета можна захаваць нават зімой?

Затым дзецям прапануецца разгледзець карціну Шышкіна, палюбаваша ёю, паразважаць над яе зместам. Гэта вельмі важны момант урока. Менавіта ў гэтыя хвіліны, калі дзеці ўважліва ўглядаюцца ў карціну, твор жывапісу выконвае сваю галоўную функцыю: уздзейнічае на пачуцці, развівае густ. Настаўніца дае магчымасць дзецям выказаць свае меркаванні, а затым пачынае аналіз карціны. Асноўным метадам аналізу з'яўляецца гутарка. Настаўніца дакладна і ясна фармулюе пытанні, падводзячы вучняў да разумення сюжэта і ідэі карціны. Улічваючы, што з пейзажнай карцінай вучням пачатковых класаў працаваць яшчэ складана, гутарку педагог дапаўняе кароткім эмацыянальным апавяданнем па змесце карціны. Жывое слова Людмілы Георгіеўны, падтрыманае зрокавым уражаннем, захапляе, выклікае цікавасць у вучняў, дапамагае ім разабрацца ў змесце карціны, выклікае жаданне самім гаварыць упэўнена, вобразна, пранікліва і шчыра:

— Быццам мора, шуміць і каласіцца жытняе поле. Толькі пасярэдзіне злёгку расступілася яно, прапускаючы палявую дарогу. Здаецца, вось-вось прасёлак знікне ў хвалях зазіхацеўшага ўсімі адценнямі золата жыта, ускалыханага наляцеўшым аднекуль гарачым ветрыкам. Зацяняючы дарогу, ластаўкі нізка «стрыгуць» нагрэтае паветра, а вышэй, над полем, на фоне бязмежнага блакітнага неба ў паўдзённую спёку паднімаюцца, шырока раскінуўшы цёмна-зялёныя галіны, адзінокія хвоі — апошнія шматвекавыя волаты, якія ўцалелі ад смалістага бору, які калісьці шумеў на месцы ўзаранага поля. Усё чакае свежага летняга дажджу, і яго ўжо прадказваюць бачныя на далягляддзе апалавыя воблачкі...

Пры складанні плана сачынення настаўніца выкарыстоўвае калектыўныя формы працы і гутарку. Паведамленне пра аўтара карціны і гісторыю яе напісання педагог даручае вучням падрыхтаваць самастойна, што спрыяе выхаванню ў іх адказнасці.

Важнай умовай добрага сачынення з'яўляецца правільная арганізацыя працы над моўнай падрыхтоўкай і складаннем тэматычнага слоўніка. Вось якія заданні падрыхтавала Людміла Георгіеўна на гэтым этапе:

1. Падбярыце сінонімы да слоў *мастак, стварае, карціна.*

2. Паслухайце і скажыце, якія з падабраных вамі вершаў рускіх паэтаў можна аднесці да гэтага пейзажу. Якія словы вы знайшлі ў гэтых творах для апісання жыта, неба, хвоек і г.д.?

Пры апісанні карціны настаўніца акцэнтуе ўвагу вучняў на такіх важных дэталях, як колер жыта, ступень яго спеласці, прыгажосць; пры апісанні неба звяртае ўвагу на слова "лазурны", значэнне якога вучні звяраюць па тлумачальным слоўніку. Адначасова вядзецца праца над удасканаленнем арфаграфічных навыкаў.

У ходзе вуснага апавядання дзеці выкарыстоўваюць словы з сумесна складзенага тэматычнага слоўніка, адбіраюць неабходныя выразы для апісання карціны. Затым вучні пішуць першы варыянт сачынення. Пасля калектыўнага рэдагавання ствараецца канчатковы варыянт.

Людміла Георгіеўна выхоўвае ў сваіх вучняў уменне назіраць і перадаваць словамі вынікі сваіх назіранняў, пры гэтым імкнецца да таго, каб дзеці падбіралі дакладныя словы і выразы для характарыстыкі заўважаных прадметаў і з'яў. Назіранні вучняў бываюць выпадковыя, стыхійныя, але настаўніца арганізуе спецыяльныя, мэтанакіраваныя назіранні (вывучэнне асобных прадметаў, назіранні за з'явамі прыроды, жыццём раслін і жывёл) і потым прапануе дзецям напісаць сачыненне-апісанне па асабістых назіраннях і ўражаннях.

Сачыненне-апісанне служыць цудоўным сродкам для развіцця дакладнай і выразнай мовы. Яно адлюстроўвае дзіцячае бачанне свету, яго маленькае "я". Па просьбе настаўніцы дзеці назіраюць за вячэрнім небам і першымі замаразкамі, за снегападам і капяжом, за вясновымі ручайкамі і першай траўкай. Пры гэтым яна дае вучням канкрэтныя заданні. Напрыклад, каб вучні ўбачылі вясенняе абнаўленне прыроды, ім прапануецца панаблюдаць за дрэвамі, на якіх ёсць гнёзды шпакоў, і прасачыць за тым, калі прылятаюць гракі, як яны будуць абжываць свае кватэры, прыгледзецца да пагоркаў, калі паявіцца першая траўка, сказаць, якая яна.

Правядзенне гэтых назіранняў, лічыць настаўніца, немагчыма без экскурсій. І не толькі ў прыроду. Так, калі яе вучні добра навучыліся чытаць, яна арганізавала экскурсію ў раённую дзіцячую бібліятэку. Адбылося першае знаёмства з гэтай установай. Гэты дзень пакінуў яркія ўспаміны ў вучняў яшчэ і таму, што работнікі бібліятэкі з удзелам дзяцей падрыхтавалі свята "Пасвячэнне ў чытачы". А на ўроку дзеці выказалі свае пачуцці і адносіны да перажытага ў форме сачынення.

Пры падборы тэматыкі сачынення Людміла Георгіеўна імкнецца да таго, каб дзеці пісалі іх па свежых уражаннях, каб сюжэты не былі надуманыя, каб яны адлюстроўвалі жыццёвую праўду, вучыць услухоўвацца, углядацца ў навакольны свет, бачыць прыгажосць прыродных з'яў. Калі дзіця навучыцца назіраць, то свет для яго будзе напоўнены адкрыццямі, аб якіх захочацца расказаць іншым.

Развіццю мовы вучняў, іх пазнавальнай і мысліцельнай дзейнасці садзейнічае выкарыстанне на ўсіх уроках тэхнічных сродкаў, якія даюць магчымасць стварыць у вучняў больш поўнае ўражанне аб той з'яве, якая вывучаецца. Прагляд, напрыклад, фільма ў спалучэнні са словам настаўніка — гэта магчымасць актыўнага ўспрыняцця рэчаіснасці.

Падрыхтоўка да такога ўрока развіцця мовы заключаецца ў тым, што настаўніца сама праглядае фільм, затым вызначае асноўны змест урока і яго выхаваўчую задачу, складае план, запісвае словы і выразы, якія неабходна растлумачыць. Урок-сачыненне на аснове фільма настаўніца праводзіць па плане:

1. *Кароткая ўступная гутарка, якая рыхтуе вучняў да ўспрыняцця зместу фільма.*

2. *Заданні (адно-два): на што звярнуць увагу ў час прагляду фільма.*

3. *Паказ фільма (можа быць аднаразовым ці шматразовым).*

4. *Свабодныя выказванні вучняў пра фільм. Напрыклад, пра што расказваецца ў фільме? Што ў ім спадабалася? Чаму?*

5. *Мэтанакіраваная гутарка па змесце ўсяго фільма і яго частак.*

6. *Работа над планам, калі план не даецца ў гатовым выглядзе.*

